4. Государственный академический русский драматический театр имени М. Горького [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.rustheatre.by/theatre/history/72-history.html– Дата доступа: 10. 02. 017.

**Ляшкевіч М.І.,** студэнтка 450Т гр.
Навуковы кіраўнік – Падарожняя А.А.

# АБ'ЕКТ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ЯК МУЗЕЙНЫ ПРАДМЕТ

Нематэрыяльная культурная спадчына з'яўляецца сувяззю паміж мінулым і будучыняй. Яна прадстаўляе сабой каштоўны набытак розных супольнасцяў, групп людзей.

У «мову» айчыннай культуралогіі паняцце «нематэрыяльная культурная спадчына» увайшло нядаўна. У пачатку XXI стагоддзя яно стала прадметам абмеркавання на розных міжнародных навуковых форумах: XIX Генеральнай канферэнцыі ІКОМ у Барселоне (2001 г.), канферэнцыі СІДОК у Порта-Алегра (2003 г.), XX Генеральнай канферэнцыі ІКОМ у Сеуле (2004 г.) і інш. У 2003 г. ЮНЕСКА прыняла «Міжнародную канвенцыю аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны». З гэтай нагоды сёння нематэрыяльная спадчына ўвайшла ў фокус даследчыцкай цікавасці як тэарэтыкаў, так і практыкаў.

У навуковай літаратуры няма адназначнага падыходу да вызначэння сутнасці паняцця нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Паводле «Міжнароднай канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны», дадзены тэрмін азначае «звычаі, формы ўяўлення і выражэння, веды і ўменні, – а таксама звязаныя з імі інструменты, прадметы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

артэфакты і культурныя прасторы, прызнаныя суполкамі людзей, а ў некаторых выпадках асобнымі людзьмі, у якасці іх культурнай спадчыны».

Аб‘екты нематэрыяльнай культурнай спадчыны з пункту гледжання музея ўмоўна можна падзяліць на 3 катэгорыі: увасобленыя ў фізічнай форме аспекты культуры і традыцыі пэўнай грамадскай супольнасці (абрады, традыцыйныя сямейна-родавыя святы, традыцыйнае света ўяўленне аб вядзенні гаспадаркі і асаблівасцях побыту); формы выяўлення, не ўвасобленыя ў фізічным стане (мова, традыцыйныя спевы, танец, гульні, мастацтва вуснай традыцыі – фальклор); знакава-сімвальнае, метафарычнае выяўленне аб‘ектаў, якім надзелены матэрыяльныя аб‘екты традыцыйнай беларускай культуры; знакі, сімвалы.

Дарэчы, нягледзячы на тое, што на самой справе музеі Беларусі ўжо не першы год захоўваюць аб‘екты традыцыйнай духоўнай культурнай спадчыны (асабліва тыя з іх, якія звязаны з фальклорам, вытворчымі працэсамі), увядзенне аб‘ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў музейную справу толькі пачынаецца [4].

У апошняе дзесяцігоддзе аб‘екты нематэрыяльнай культурнай спадчыны шырока выкарыстаюцца ў дзейнасцьшэрагу музеяў свету. Аднак аналіз дзейнасці музеяў Беларусі дае падставу сцвярджаць, што прыкладна толькі каля 0 % музеяў ад агульнай іх колькасці даволі грунтоўна займаюцца сваёй дзейнасці рэпрэзентацыяй нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Гэта Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, Музей народнай культуры Мазыршчыны «Палесская веда», Веткаўскі музей народнай творчасці, Гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе», Музей ручнога традыцыйнага ткацтва Паазер‘я, Ашмянскі этнаграфічны музей «Млын», Браслаўскае раённае аб‘яднанне музеяў, Віцебскі абласны краязнаўчы музей, Ганцавіцкі краязнаўчы музей, Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей, Дрыбінскі раённы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гісторыка-этнаграфічны музей, «Дудуткі» (недзяржаўны музейны комплекс), Ельскі краязнаўчы музей, Івацэвіцкі гісторыка-краязнаўчы музей, Калінкавіцкі краязнаўчы музей, Купалаўскі мемарыяльны запаведнік «Вязынка», Лельчыцкі раённы краязнаўчы музей, Магілёўскі музей этнаграфіі і некаторыя іншыя.

Змест нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якая рэпрэзентавана і захоўваецца ў музеях Беларусі, складаюць элементы, створаныя папярэднімі пакаленнямі, якія ўяўляюць выключную значнасць для культурнага генафонда нацыі і спрыяюць будучаму культурнаму прагрэсу і праяўляюцца ў наступных абласцях: вусныя традыцыі і формы выяўлення, уключаючы мову ў якасці носьбіта нематэрыяльнай культурнай спадчыны; выканальніцкія майстэрствы; звычаі, абрады, якія адносяцца да прыроды і сусвету; веды і ўменні з традыцыйнымі рамёствамі.

Сутнасць нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў тым, што яна з‘яўляецца шматфункцыянальнай сістэмай, якая адлюстроўвае непарыўную сувязь эпох і пакаленняў, цесна звязана з яе стваральнікамі, носьбітамі і транслятарамі. Па-за межамі традыцыі і традыцыйнага светапогляду элементы нематэрыяльнай культурнай спадчыны могуць захоўвацца ў задакументаваным выглядзе і быць рэпрэзентаваныя пры наяўнасці транслятара традыцыі альбо музейнага супрацоўніка, які пераняў гэтую традыцыю ад носьбіта. Такая формы працы з аб‘ектамі нематэрыльнай культурнай спадчыны змяншае іх аўтэнтычнасць, аднак дазваляе рэпрэзентаваць пры тых абставінах, калі існуюць поўныя і навукова дакладныя звесткі пра яе, але адсутнічае носьбіт традыцыі.

Галоўнай умовай бытавання, функцыянавання і трансляцыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў сучасным грамадстве з‘яўляецца традыцыя як сістэма, здольная да самаразвіцця (саматрансляцыі), і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

засваенне новымі пакаленнямі элементаў культурнай спадчыны мінулага, і пераемнасць пакаленняў, якая наладжвае сувязь паміж мінулым і сучасным. З чаго вынікае, што музейная рэпрэзентацыя элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны павінна, найперш, уключаць мастацкае праектаванне, рэалізацыю (візуалізацыю) мастацкай ідэі. У працэсе рэпрэзентацыі элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны павінны быць злітыя ў адно цэлае вобраз і сэнс. У такой мадэлі найбольш дасканала і моцна выказана вобразна-сімвалічная цэласнасць элемента нематэрыяльнай культурнай спадчыны як творчага працэсу [1].

Рэпрэзентацыя аб‘ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчына ажыццяўляецца ўстановамі музейнага тыпу на аснове тэзаўруснага падыходу. Выкарыстанне дадзенага падыходу звязана з тым, што адлюстраваць усе праявы нематэрыяльнай культурнай спадчыны аднаму суб‘екту немагчыма. Тэзаўрус – гэта структураванае прадстаўленне і агульны вобраз той часткі сусветнайкультуры, якую можа асвоіць суб'ект [3]. Так, напрыклад, у Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту на сёнешні дзень дзейнічаюць 3 экспазіцыйных сектара («Цэнтральная Беларусь», «Падняпроўе» і «Паазер'е»), кожны з якіх рэпрэзентуе музейныя аб‘екты канкрэтнага рэгіёну.

Даследаванне дзейнасці ўстаноў сферы культуры Рэспублікі Беларусь па рэпрэзентацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны паказала, што іх практыка ўтрымлівае наступныя метады: дакументаванне, фіксацыю, рэвіталізацыю і мадэляванне.

Улік аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны ажыццяўляе Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, у складзе якога ў 2004 г. было створана ўпраўленне па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі. З 1994 г. вядзецца Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь, які ў цяперашні час налічвае 79

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нематэрыяльных аб'ектаў спадчыны. Фіксацыя прымяняецца там, дзе з'ява культуры яшчэ жывая; ревіталізація – там, дзе традыцыя знаходзяцца на мяжы поўнага згасання, але яшчэ захоўваюцца ў памяці соцыума; мадэляванне – у выпадку, калі традыцыю даводзіцца аднаўляць на падставе сучасных навуковых даследаванняў [2].

Згодна з дадзенымі метадамі, практычны вопытустаноў музейнага тыпу дазваляе вылучыць некалькі мадэлей рэпрэзентацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

Даволі распаўсюджанай з‘яўляецца мадэль «Жывое бытаванне». Такая метадалагічна абгрунтаваная форма працы з нематэрыяльнай спадчынай прадугледжвае захаванне і рэпрэзентацыю яе аб‘ектаў праз разнастайныя інтэрактыўныя сродкі ўзаемадзеяння наведвальнікаў музеяў з непасрэднымі носьбітамі традыцыі. Пры выкарыстанні гэтай мадэлі рэпрэзентацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны музейным аб‘ектам можа выступаць і носьбіт традыцыі. Узорам такой мадэлі з‘яўляецца Недзяржаўны музейны комплекс старажытных народных рамёстваў і тэхналогій «Дудуткі», які мае не толькі экспазіцыю і выставачную залу матэрыяльнай і нематэрыяльнай культуры, але і працуючыя кузню, ганчарню і рэстаўрацыйныя майстэрні, дрэваапрацоўчы цэх, пякарню, сыраварню, мукамольны цэх (вятрак), пчальнік, стайню, жывёлагадоўчую ферму, корчмы, невялікі заезны дом і славянскі бровар з арыгінальнымі хатнімі напіткамі. Да таго ж комплекс утрымлівае разнастайных хатніх жывёл і птушак. Наведвальнікаў музея вучаць ездзіць вярхом, запрагаць фаэтон, шарабан, сані-розвальні і інш.

Выкарыстоўваецца музеямі і мадэль «Музейная рэканструкцыя». Дадзеная форма прадугледжвае пабудову рэпрэзентацыі аб‘ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны на аснове задакументаваных сведчанняў пра традыцыю. Яны, як правіла, валодаюць дастаткова высокай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

доляй інфармацыйнасці і адпавядаюць крытэрыю навуковай дакладнасці. Так, напрыклад, у рэпрэзентацыйную мадэль Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту ўбудаваны элементы рэканструкцыі ў спалучэнні з аўтэнтычнымі элементамі. На святах «Гуканняў вясны», «Масленіцы», «Юр‘і», «Каляды» і інш. у БДМНАП навуковыя супрацоўнікі пераапранаюцца ў рэканструяваныя строі і ў рэканструяванай прасторы ўводзяць у святочнае дзейства наведвальнікаў. Аўтэнтычнымі ж элементамі ў мадэлі такой рэпрэзентацыі выступаюць фальклорныя гурты, якіх супрацоўнікі музея запрашаюць на святы.

Яшчэ адна мадэль «Музейнае мадэляванне» дазваляе супрацоўнікам музеяў эксперыментаваць у пошуку новых увасабленняў і аб‘ектаў з мэтай трансляцыі, актуалізацыі традыцыйнай народнай культуры з выкарыстаннем элементаў як матэрыяльнай, так і нематэрыяльнай культуры. Мадэляванне ўяўляе сабой працэс аднаўлення аб‘ектаў рэчаіснасці ў выглядзе імітацый, а канструяванне прадугледжвае выкарыстанне элементаў матэрыяльнай і духоўнай спадчыны для стварэння новых аб‘ектаў на аснове распрацаванай музеямі канцэпцыі. У Докшыцкім, Браслаўскім, Гарадоцкім, Ушацкім, Шаркаўшчынскім дамах рамёстваў адноўлены старажытныя тэхналогіі абварной, чорназадымленай, палíванай керамікі. У Лепельскім, Гарадоцкім, Шумілінскім, Глыбоцкім, Браслаўскім дамах рамёстваў працуюць калектывы маладых ткачых, вядзецца сумесная з музеем навукова-даследчая праца па рэканструкцыі лакальных асаблівасцей народнага строю і народнага арнаменту, што зафіксавана ў навукова-фондавай дакументацыі музея і рэпрэзентуецца падчас канферэнцый і святаў, у якіх удзельнічае музей. Адноўлена больш за 20 відаў традыцыйных рамёстваў Беларусі. Дзеці і дарослыя ў музеі народнай творчасці пераймаюць ад народных майстроў традыцыі ткацтва, ганчарства, саломапляцення [4].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, знікненне тысячагадовых традыцый, згасанне традыцыйных форм гаспадарання, забыццё традыцыйнай культуры розных народаў і этнасаў выклікала неабходнасць прыняцця з боку грамадскай супольнасці неадкладных мер па захаванні і трансляцыі аб‘ектаў духоўнай спадчыны традыцыйнай культуры Беларусі. Гэта стала падставай да актыўнага выкарыствння аб‘ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў музейнай дзейнасці.

---

1.Кананович, С.К. К вопросу определения объектов наследия устной традиции в культурологии / С. К. Кананович // Вестник Института современных знаний. – 2010.– № 1.– С. 79-82.

2. Каулен, М.Е. Нематериальные объекты наследия в современном музее / М.Е. Каулен // От краеведения к культурологии: Российскому институту культурологии 70 лет : сб. науч. ст. / Рос. ин-т культурологии; [редкол.: К.Э. Разлогов (отв. ред.) и др.].– Москва, 2002. – С. 54-56.

3. Луков, В.А. Тезаурусный подход в гуманитарных науках / В.А. Луков // Знание. Понимание. Умение: фундаментальные и прикладные исследования в области гуманитарных наук. – 2004. – № 1. – С. 93-100.

4. Смолік, А.І. Нематэрыяльная культурная спадчына (да пастаноўкі праблемы) / А.І. Смолік // Универсальное и национальное в культуре : сб. науч. ст. / Белорус. гос ун-т; редкол.: Э.А. Усовская (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2012. – С. 32-240.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ